# Сцежкамі Брэсцкага дэндрыарыя

**Дэндрарый - гэта месца, дзе можна убачыць разнастайнасць раслінага свету. У дэндрарыі Брэсцкага дзяржаунага універсітэта Імя А. С. Пушкіна больш за 788 відаў дрэў і кустарнікаў! Гэта прадстаунікі як мясцовай флоры, так і розных рэгіёнау Зямлі Паўночнай Амерыкі, Далёкага Усходу, Цэнтральнага Кітая, Крыма, Каўказа...**

У 1968 годзе Брэсцкаму дзяржаўнаму ўніверсітэту Імя А. С. Пушкша (БрДУ Імя А. С. Пушкіна) для стварэння аграпрамысловай біялагічнай станцыі бы падараваны зямельны участак на тэрыторыі былога форта № 9, дзе знаходзілася несанкцыянаваная гарадская звалка. Апрача таго, зямля была нашпігаваная боепрыпасамі XIX-XX стагоддзяў. Каб навесці парадак, студэнтам і выкладчыкам давялося прыкласці шмат намаганняў. Першыя пасадкі сталі магчымымі толью на пачатку 1970-х. У 1973 годзе быў распрацаваны праект дэндрарыя, плошча якога склала 5 га. Планавалася, што ён стане часткай вялiгага батанічнага саду.

У тым жа годзе высадзілі першыя алеі каштана конскага звычайнага, ляшчыны звычайнай, бярозы

**Форт № 9 Брэст-Літоускай крэпасці быў узведзены у 1883-1888 гадах і уваходзіў у абарончы пояс Кобрынскага інжынернага аддзела. Пры будаўніцтве для цэглы выкарыстоўвалі адборную белую гліну, якую вазілі з-пад Архангельска. Да 1915 года ў форце грунтавалася артылерыйская рота.**

**Пры адступленні рускай арміі ў сярэдзіне 1915 года ўмацаванне было ўзарвана. Да цяперашняга часу захавалася аснова каменнага маета, частка цаглянага казэмата і абводны канал, а таксама невялікі дом жандармнага ўнтэр-афіцэра і двух інжынерау. Зараз ён пераабсталяваны ў кабінеты спецыялістаў і навучальныя класы. Тут жа знаходзіцца і аддзел «Аграбіялопя» БрДУ Імя А. С. Пушкіна.**

**У дэндрарыі можна сустрэць і прадстаунікоу птушынага і жывёльнага свету: шэрую чаплю, соў, курапатак, вожыкаў, вавёрак, кунщ, ліс і інш.**

барадаўчатай і пухнатай. У 1977-м калекцыя папоўшлася дубам паўночным, ёлкай калючай, туяй заходняй, рознымі відамі рабіны, бэзу, чаромхі.

Пры стварэнні дэндрарыя быў пракладзены летні вадаправод для паліву, аднак неўзабаве ён зламаўся. У сувязі з дранным глебавымі і гідралапчнымі ўмовамі многія расліны запнулі, і далейшыя пасадкі вяліся не па геаграфічным, а экалагічным прынцыпе (з арыентацыяй на прыстасаванасць да ўзроуню асветленасці, воднага рэжыму, хімічнага складу глебы).

У 2004 годзе для папаўнення і абнаўлення раслінага фонду быў закладзены гадавальнік драўняных раслін, у якім зараз налічваецца 60 відаў (звыш 800 экз.).

**Апрача дэндрарыя, у аддзеле «Аграбіялопя» знаходзяцца пладовы сад і гадавальнік. У першым вырошчваюцца хваёвыя і дэкаратыуныя расліны для рэалізацыі фізічным асобам і прадпрыемствам. У другім прадстаўлены пладова-ягадныя культуры: яблыні, буякі, вінаград, маліна, журавіны. Калекцыя ўвесь час папаўняецца новымі відамі і сартамі. Ёсць і участак дэкаратыўна-кветкавых раслін, доследныя палі, дзе штогод праводзяцца навуковыя даследаванні.**

Дзякуючы стараннай працы супрацонікаў, калекцыя раслін захавалася. Цяпер яна налічвае больш за 788 відаў, з іх - 533 травяністых і 255 драўняна-хмызняковых. Да інтрадуцыраваных відаў, якія рэдка сустракаюцца на тэрыторыі Беларусі, адносяцца магнолія зваротнаяйкападобная, гінкга двухлопасцевая, хвоя чорная, лох серабрысты і інш.

У 2014 годзе была створана экасцежка «Дзікая прырода у горадзе Брэсце». На ёй размешчаны дзесяць стаянак, абсталяваных інфармацыйнымі стэндамі. Падчас прагулкі можна убачыць рэдкія віды дрэў, кустоў і травяністых раслін, а таксама зайцаў, гарнастаяў, баброў, балотных чарапах.

**Дзмітрый ПРУДНІКАЎ**